Источник: **«Краязнаўчая газета» - 2013-03-28**

## Магілёў гістарычны

Аддзел культуры Магілёўскага гарвыканкама, Музей гісторыі Магілёва, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі запрашаюць прыняць удзел у працы VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць», прысвечанай атрыманню Магілёвам статуса культурнай сталіцы СНД і Беларусі. Канферэнцыя адбудзецца 27 і 28 чэрвеня ў Магілёве.

Праблематыка канферэнцыі:

- сацыяльна-эканамічная і палітычная гісторыя рэгіёну;
- ваенная гісторыя. Чалавек на вайне: штодзённасць і культурныя вобразы;
- канфесійныя працэсы на Магілёўшчыне;
- з гісторыі развіцця грамадска-палітычнай, прававой і філасофскай думкі;
- духоўныя традыцыі: літаратура і мастацтва;
- гісторыя магілёўскага кнігадрукавання;
- асаблівасці матэрыяльнай культуры рэгіёну;
- археалогія рэгіёну. Рэч і слова: артэфакт і культурныя кантэксты артэфакта;
- традыцыі адукацыі, выхавання і навукі;
- праблемы крыніцазнаўства, археаграфіі і гістарыяграфіі рэгіёну;
- вобраз Магілёва ў культурных дыскусіях замежжа;
- славутыя магілёўцы.

Рабочыя мовы канферэнцыі – беларуская і руская. Для ўдзелу неабходна да 15 красавіка падаць матэрыял дакладаў (у электронным выглядзе) і заяўку ў аргкамітэт. У заяўцы пазначаюцца: прозвішча, імя, месца працы (вучобы), пасада, вучоная ступень і званне, тэма даклада, паштовы і электронны адрас, нумар тэлефона.

Адрас аргкамітэта: 212030, Рэспубліка Беларусь, г. Магілёў, вул. Ленінская 1а, Музей гісторыі Магілёва, тэл./факс +375 222 229946, e-mail: ratusha.mogilev@gmail.com.

***Паводле інфармацыі арганізатараў***